# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

**Звесткі з архіва**
**Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі**

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

**Бядуля, З. Салавей : Аповесьці / Зьмітрок Бядуля. – Менск [Мінск] : Бел. Дзярж. Выд-ва, 1928. – 322, [2] с.**

95 гадоў




У зборнік Змітрака Бядулі (Самуіла Яфімавіча Плаўніка; 1886–1941) увайшлі такія творы, як «Тры пальцы», «Дзесяць» і загалоўная гістарычная фальклорна-рамантычная аповесць «Салавей», першая частка якой раней, у 1927 годзе, была надрукавана на старонках альманаха «Узвышша».

Вокладка выдання аформлена Генадзем Змудзінскім (1897–1938), мастаком і адным з заснавальнікаў беларускай савецкай кніжнай графікі. Тыраж – 3000 экзэмпляраў.

# «Салавей» : 95 гадоў

Падзеі, што апісваюцца ў аповесці «Салавей», пераносяць чытача ў эпоху прыгоннага права (адбываюцца паміж 1787–1793 гг.) і прадстаўляюцца ў такім выглядзе, у якім яны адлюстраваліся і захаваліся ў памяці старога апавядальніка, былога слугі паноў Вашамірскіх.

Галоўнага героя твора Сымона празвалі Салаўём за яго здольнасць падрабляць гукі прыроды і жывых істот. Гэты талент хацеў выкарыстаць пан Вашамірскі, у якога быў тэатр з прыгоннымі акцёрамі. Падчас рэпетыцый пан загадваў жорстка катаваць артыстаў за недасканалае вымаўленне польскіх слоў або за іншыя адхіленні ад патрабаванняў рэжысёра і мецэната. Жорсткі пан не адпусціў прыгонную актрысу да маці, якая памірала і хацела апошні раз сустрэцца з дачкою...

Сымону невыносна быць пацехай для пана ў яго маёнтку. Герой цяжка пакутуе, бачачы жудасныя расправы над безабароннымі людзьмі. Пасля трагедыі ў сям’і Каспара, смерці Зоські герой уцякае ад пана Вашамірскага і са сваімі сябрамі-аднадумцамі помсціць і пану, і яго падручным.

Як адзначаюць даследчыкі, паказваючы драматычны лёс мастака ва ўмовах прыгоннага тэатра, Змітрок Бядуля тым самым сцвярджае, што асновай сапраўднай творчасці з’яўляецца духоўная свабода і незалежнасць чалавека.

# «Салавей» : 95 гадоў




Другое выданне аповесці «Салавей» адбылося ўжо ў наступным, 1929-м, годзе. У гэтым выданні змест твора меў некаторыя змяненні. У прыватнасці, Змітрок Бядуля адкінуў «прадмовы», зрабіўшы пачаткам аповесці характарыстыку галоўнага героя.

# «Салавей» : 95 гадоў




У 1932-м годзе «Салавей» выйшаў трэцім выданнем, але на гэты раз ужо з больш значнай аўтарскай перапрацоўкай. У прадмове да гэтага выдання Змітрок Бядуля напісаў: «Рыхтуючы да друку трэцяе выданне «Салаўя», я нанова перапрацаваў гэтую аповесць; падзяліў яе на тры часткі, выправіў ранейшы тэкст, даў назвы раздзелам і дапісаў некалькі новых, а іменна: «Генеральная рэпетыцыя». «Божая маці», «Трывожыліся людзі», «У пушчы» і «Помста».

На думку літаратурных крытыкаў, «перапрацоўка» не пайшла на карысць аповесці. Аўтар дапісаў шматлікія карціны фізічнага катавання акцёраў, і гэтыя празмерныя натуралістычныя малюнкі абцяжарылі «Салаўя» і нават перакрэслілі тое красамоўнае, па-мастацку яркае, што было ў часопісным варыянце аповесці і яе першых двух выданнях.

# «Салавей» : 95 гадоў

● Па матывах аповесці Змітрака Бядулі «Салавей» у 1937 годзе быў створаны першы беларускі балет (у 4 дзеях). Лібрэта напісалі Юрый Сланімскі і Аляксей Ермалаеў, кампазітар – Міхаіл Крошнер, дырыжор – Ілья Гітгарц. Упершыню балет пастаўлены ў 1938 годзе ў Адэсе. На сцэне Мінскага тэатра оперы і балета прэм’ера адбылася 11 мая 1939 года.

● Паводле аповесці «Салавей» Змітрок Бядуля напісаў аднайменную п’есу, якую паставілі ў 1937 годзе на сцэне Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-1, зараз – Нацыянальны акадэмічны драмтэатр імя Янкі Купалы). Спектакль з поспехам ішоў і пасля Вялікай Айчыннай вайны.

# «Салавей» : 95 гадоў

● Паводле аповесці «Салавей» у БССР быў створаны адзін з першых мастацкіх фільмаў. Экранізацыя твора адбылася ў 1937 годзе на кінастудыі «Белдзяржкіно». Рэжысёр – Эдуард Аршанскі. Сцэнарый напісалі сам Змітрок Бядуля і малады кінематаграфіст Мікола Таўбэ.



П. Масоха ў ролі Сымонкі



М. Стралкова ў ролі панны Ядвігі



У. Гардзін у ролі пана Вашэмірскага